ция: создаются отдельные странички по уборке или сортировке мусора, поддержке экологии, развиваются личные страницы экоблогеров, которые пропагандируют «зеленые идеи». Однако базовые формы регулирования экологических процессов, охрана окружающей среды, а также сфера экологического образования остаются за государством.

### Библиографические ссылки


1. *Давыдова О*. Новый Экокодекс. Газета Литер. 05.02.2020 [Электронный ресурс]. URL: https://liter.kz/novyj-ekokodeks/ (дата обращения: 08.09.2021).
2. Новый Экологический кодекс в борьбе за экологию способен негативно повлиять как на экономику Казахстана… 29 апр., 2020 [Электронный ресурс]. URL: https://www.zakon.kz/5019781-kak-novyy-ekokodeks-mozhet-otrazitsya.html (дата обращения: 09.09.2021).
3. Как заботясь об экологии можно навредить экономике. 15 апр., 2020 [Электронный ресурс]. URL: https://informburo.kz/special/kak-zabotyas-ob-ekologii-mozhno-navredit-ekonomike.html (дата обращения: 12.09.2021).
4. Молодежные тренды в Казахстане [Электронный ресурс]. URL: ttps://www.brif.kz/molodezhnye-trendy-v-kazaxstane/ (дата обращения: 01.09.2021).
5. *Токаев К*. Конструктивный общественный диалог – основа стабильности и процветания Казахстана / Послание Президента К. Токаева народу Казахстана / 2 сентября 2019 года [Электронный ресурс]. URL: http://www.akorda.kz/ru/addresses/addresses_of_president/poslanie-glavy-gosudarstva-kasym-zhomarta-tokaeva-narodu-kazahstana (дата обращения: 12.09.2021).


# ГУМАНІСТЫЧНАЯ АСНОВА БЕЛАРУСКАЙ ЖУРНАЛІСТЫКІ


***Н. А. Зубчонак***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Zubchon@bsu.by*



У артыкуле аўтар звяртаецца да гісторыі беларускага Адраджэння, таго перыяду, калі ў грамадскай думцы фармуляваліся важнейшыя прынцыпы жыццядзейнасці, духоўныя каштоўнасці, якія аказалі значны ўплыў на развіццё беларускай нацыі, яе навукі і культуры.



***Ключавыя словы:*** рэнесанс; беларуская мова; Вялікае княства Літоўскае; гуманізм; патрыятызм; выдавецкая дзейнасць; журналістыка.

# HUMANISTIC BASIS
# OF BELARUSIAN JOURNALISM

***N. A. Zubchonak***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: N. A. Zubchonak (Zubchon@bsu.by)*

In the article the author addresses the history of the Belarusian Renaissance, the period when the most important principles of life, spiritual values were formulated in public opinion, which had a significant impact on the development of the Belarusian nation, its science and culture.

***Key words:*** renaissance; Belarusian language; Grand Duchy of Lithuania; humanism; patriotism; publishing; journalism.

З моманту выхаду першага друкаванага выдання на старабеларускай мове газеты-аднадзёнкі «Навіны грозныя а жаласлівыя…» (1563 г.) прайшло больш за чатыры стагоддзі. За гэты час назапашаны вялікі вопыт выдавецкай дзейнасці, сфарміравана нацыянальная сістэма сродкаў масавай інфармацыі, выпрацавана метадалогія яе функцыянавання. Сёння беларуская журналістыка адпавядае сусветным стандартам, пастаянна развіваецца, акумулюючы навукова-тэарэтычны і практычны аспекты ў адлюстраванні рэчаіснасці.

Імклівае развіццё сучасных інфармацыйных тэхналогій, паскарэнне тэмпаў жыцця, рост матэрыяльнага забеспячэння і іншыя акалічнасці паступова прыводзяць сёння да дэвальвацыі чалавечых каштоўнасцей. Сусветная гісторыя сведчыць аб тым, што на розных яе этапах менавіта стаўленне да чалавека, вызначэнне яго ролі ў гістарычным працэсе як раз і вызначала сам гэты працэс. Па гэтай прычыне застаецца актуальнай неабходнасць звароту да ключавых этапаў гісторыі народаў, якія паўплывалі іх лёс, на развіццё палітыкі і культуры.

Вельмі значным для айчыннай гісторыі стаў перыяд Вялікага княства Літоўскага, час фарміравання народнасці, эпоха гуманізму і Рэнесансу. Пастаянныя кантакты беларусаў з прадстаўнікамі іншых народаў, літоўцамі, украінцамі, балгарамі, чэхамі і інш., садзейнічалі ўзбагачэнню нацыянальнай культуры. Гісторыкі справядліва сцвярджаюць, што «найбольш адукаваныя прадстаўнікі маладой беларускай народнасці

правільна ўяўлялі значэнне разумных суадносін паміж нацыянальнымі (унутранымі) і інтэрнацыянальнымі (знешнімі) фактарамі ў культуры… Кожны такі прадстаўнік… імкнуўся дзеля гэтага не толькі да канца вычарпаць уласны патэнцыял, але і ўзбагаціць яе найлепшымі здабыткамі культур іншых народаў» [1, с. 37–38].

Важнай асабівасцю рэнесанснай эпохі стала тое, што ў працэсе асваення рэчаіснасці на першым плане знаходзіўся заўсёды чалавек з яго магчымасцямі, духоўнымі і фізічнымі, прагай да пазнання свету, непераадольным жаданнем змяніць яго з дапамогай ведаў. Так, у перыяд Адраджэння выпрацоўваліся прынцыпы пабудовы грамадства, такія як справядлівасць, павага да асобы. Лепшыя прадстаўнікі беларускай моладзі (М. Гусоўскі, Ф. Скарына, С. Будны і інш.) вучыліся ў еўрапейскіх універсітэтах (Кракаў, Прага, Лейпцыг, Базель, Падуя), а потым вярталіся на Радзіму, каб свой талент і веды перадаць народу, краіне. У сённяшніх умовах гэтая акалічнасць набывае асаблівае значэнне, паколькі ў апошні час назіраецца адваротная тэндэнцыя – вялікая колькасць маладых і таленавітых людзей імкнецца з’ехаць за мяжу, што ўяўляе рэальную небяспеку для эканомікі, навукі і культуры нашай краіны.

Такім чынам, у XVI ст. значна пашырыліся сувязі беларусаў з іншымі народамі. Так, цікавым фактам узаемадзеяння беларускай і польскай культур стала выданне ў Кракаве яшчэ ў XV ст. некалькіх кніг на кірыліцы («Актохі», «Часаслоў»). Паказальна, што беларуская друкарня там з’явілася раней за польскую [1, с. 40]. У той жа час культурныя кантакты з Расіяй амаль адсутнічалі. Гэта абумоўлена складанай сацыяльна-палітычнай сітуацыяй у суседняй дзяржаве, выкліканай наступствамі татара-мангольскага нашэсця на рускія землі, моцным уплывам царквы на палітыку дзяржавы, а таксама працэсам аб’яднання тэрыторыі вакол новага цэнтра – Масквы. Усе вышэйназваныя фактары стрымлівалі працэс Адраджэння на Русі.

Выключнае значэнне для гісторыі беларускай культуры, навукі і, безумоўна, журналістыкі мае выдавецкая дзейнасць Ф. Скарыны. Праз яго выданні грамадства паступова падыходзіла да ўсведамлення неабходнасці навуковага пазнання рэчаіснасці, яе філасофскага асэнсавання, фіксацыі важнейшых сацыяльна-палітычных падзей. Кнігі Біблііі не адлюстроўвалі факты і падзеі сучаснасці. У той жа час у іх былі закладзены больш грунтоўныя ідэі. Па-першае, кніга, няхай і рэлігійнага зместу, стала сродкам асветы і адукацыі для народа (дарэчы,

абсалютна ўнікальны факт, які да сённяшняга дня не мае аналагаў у сусветнай гісторыі – Н. З.). Яшчэ адна не менш важная акалічнасць: праз свае друкаваныя кнігі Ф. Скарына распаўсюджваў веды па асноўных навуках, якія выкладалі ў еўрапейскіх універсітэтах (граматыка, логіка, рыторыка, музыка, геаметрыя, арыфметыка, астраномія – гэта так званыя сем «свабодных мастацтваў»). Працэс навучання павінен быў, на думку аўтара, весціся толькі на роднай мове. У ВКЛ беларуская мова мела статус дзяржаўнай. Па-другое, тыя філасофскія ідэі, сфармуляваныя аўтарам у прадмовах і каментарыях да выданняў, потым былі выкарыстаны ў працэсе распрацоўкі важнейшых дзяржаўных дакументаў Вялікага княства Літоўскага. Так, існуе меркаванне, што Ф. Скарына нават прымаў удзел у падрыхтоўцы Статута ВКЛ 1529 г. Адным з аргументаў на карысць дадзенай версіі з’яўляецца тое, што «асобныя палажэнні, выказаныя Скарынам у яго кнігах, супадаюць са зместам артыкулаў Статута» [2, с. 24].

Асветніцкую, філасофскую і выдавецкую дзейнасць Ф. Скарыны прадоўжылі яго паслядоўнікі. Друкаваннем і распаўсюджваннем кніг на беларускай мове займаліся С. Будны, В. Цяпінскі, М. Сматрыцкі і інш. Так, С. Будны першым пачаў выпуск беларускамоўных кніг на тэрыторыі Беларусі. Акрамя таго, ёсць версія, што менавіта ў яго друкарні, якая знаходзілася ў Нясвіжы, як раз і была надрукавана газета-аднадзёнка «Навіны грозныя а жаласлівыя…» [3, с. 19]. У інфармацыйным лістку змяшчаліся звесткі пра адну з падзей Лівонскай вайны, у прыватнасці пра захоп Полацка войскамі Івана IV у 1562 г. Прадстаўленая аўтарамі там інфармацыя сёння мае як гістарычную, так і навуковую каштоўнасць. У сувязі з гэтым мы можам справядліва сцвярджаць, што і беларуская журналістыка пачынае фарміравацца менавіта ў XVI ст.

Такім чынам, падмурак беларускай нацыянальнай культуры і журналістыкі як неад’емнай яе часткі быў закладзены ў перыяд Вялікага княства Літоўскага, у час фарміравання важнейшых для чалавецтва ідэй, рэформаў сацыяльна-палітычнай сістэмы ў еўрапейскіх краінах. Філасофія Адраджэння садзейнічала распаўсюджванню такіх канцэптуальных асноў жыццядзейнасці грамадства, як справядлівасць, гуманізм і патрыятызм.

Далейшае развіццё беларускай журналістыкі адбывалася ў складаных умовах пастаяннага змагання народа за сваё нацыянальнае, а потым і дзяржаўнае самавызначэнне. Толькі ў пачатку XX ст. была сфарміравана

сістэма беларускіх сродкаў масавай інфармацыі, выпрацаваны законы яе функцыянавання.

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Лыч Л., Навіцкі У.* Гісторыя культуры Беларусі. Мінск: Экаперспектыва, 1996. 453 с.
2. *Бярозкіна Н. Ю*. Гісторыя кнігадрукавання Беларусі (XVI – пачатак XX ст.). Мінск: Беларуская навука, 1998. 199 с.
3. *Говін С. В*. Гісторыя беларускай журналістыкі (1563–1917 гг.): вучэб.-метад. комплекс. Мінск: БДУ, 2003. 99с.


# ЦИФРОВИЗАЦИЯ КАК ТРЕНД СОВРЕМЕННОЙ ЖУРНАЛИСТИКИ КАЗАХСТАНА

***Г. Ж. Ибраева***

*Казахский национальный университет им. аль-Фараби,*
*пр. аль-Фараби, 71, 050040, г. Алматы, Республика Казахстан,*
*Galiya.Ibrayeva@kaznu.kz*

В стране на государственном уровне активно внедряется программа «Цифровой Казахстан», в которой одно из направлений – «повсеместное внедрение цифровых технологий для повышения конкурентоспособности различных отраслей экономики». В медиаиндустрии успехи «цифровой революции» очевидны. Интернет и социальные сети, особенно в период пандемии, привели к росту потребления информации. При этом доверие к информации в традиционных СМИ сохраняется.

***Ключевые слова:*** цифровизация медиа; пандемия; журналисты; новости; социальные сети; Казахстан.

# DIGITALIZATION AS A TREND MODERN JOURNALISM OF KAZAKHSTAN

***G. Zh. Ibrayeva***

*Al-Farabi Kazakh National University,*
*71, al-Farabi Ave., 050040, Almaty, Republic of Kazakhstan*
*Corresponding author: G. Zh Ibrayeva (Galiya.Ibrayeva@kaznu.kz)*

In the country, at the state level, the program «Digital Kazakhstan» is being actively implemented, in which one of the directions is «the widespread